Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-09-12

# На тым тыдні...

✓Напрыканцы жніўня **110-годдзе адзначыла вёска Чарчэт** Тайшэцкага раёна (Іркуцкая вобласць, Расія), заснаваная беларускімі перасяленцамі. Сябры Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя І. Чэрскага пад час урачыстасцяў перадалі вёсцы двухмоўную шыльду, прысвечаную юбілею, якая неўзабаве будзе ўсталявана на ўездзе ў паселішча.







Варта дадаць, што на сценах дамоў, платах і брамах тут выразаюць і накладваюць традыцыйныя беларускія зоркі і ромбы, такія, як і на нацыянальных арнаментах; большасць вяскоўцаў разумеюць беларускую мову, а многія – размаўляюць на ёй.

✓**2 верасня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылі **выстаўку «Вучні Якуба Коласа»**, прымеркаваную да Дня ведаў. Прадстаўленыя матэрыялы распавядаюць пра педагагічную дзейнасць пісьменніка, пра ўзаемаадносіны з вучнямі (кнігі з дарчымі надпісамі, лісты былых вучняў да творцы і інш.).

На адкрыцці выстаўкі выступілі малодшы сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч, унучка паэта Марыя Міцкевіч, доктар філалагічных навук, прафесар Вячаслаў Рагойша.

✓**4 верасня** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва пачала працу **выстаўка «Крок у змрок»** Уладзіміра Лапо, на якой прадстаўленыя творы графікі розных гадоў і скульптуры, выкананыя ў тэхналогіі прамога ліцця.

✓**4 верасня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі **прадставілі выстаўку «450-годдзе Брэсцкай Бібліі»**. На ёй можна не толькі пабачыць рарытэтны экземпляр і прыгажосць яго мастацкага афармлення, даведацца пра асабісты лёс кнігі, але і пазнаёміцца з даследаваннямі айчынных і замежных навукоўцаў, прысвечанымі ўнікальнаму выданню. Сярод экспанатаў і падрыхтаванае бібліятэкай электроннае выданне на DVD, якое змяшчае поўную залічбаваную копію Брэсцкай Бібліі, навуковыя артыкулы пра гісторыю стварэння і асаблівасці прадстаўленага экземпляра.

*Падрабязней – на старонцы 2.*

✓**5 верасня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **літаратурная вечарына пісьменніка і грамадскага дзеяча Уладзіміра Мацвеенкі.**

Загадкі, сатырычныя творы і эпіграмы Уладзіміра Мацвеенкі друкаваліся ў часопісах «Бярозка», «Вясёлка» і «Пралеска», зборніках для дзяцей і юнацтва «Заранка» і «Цвіце верас». Уладзімір Іванавіч аўтар кніг «Лекі без аптэкі», «Азбука ў загадках», «Сябрынка», «Старонachкі з моўнай скарбоначкі» і інш. У сваіх кнігах паэт не толькі змяшчае лічылкі і шарады, але і тлумачыць сваім маленькім чытачам літаратурныя тэрміны, дае карысныя парады.

У мерапрыемстве бралі ўдзел галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Уладзімір Мазго, пісьменнікі Уладзімір Саламаха, Ніна Галіноўская, Генадзь Пашкоў, Міхась Пазнякоў, Ганад Чарказян, Мікола Чарняўскі, Мікола Маляўка.

✓**7 верасня** ў Музеі народнай архітэктуры і побыту пад адкрытым небам прайшоў штогадовы **фолкфэст «Камяніца»**. На галоўнай сцэне выступілі беларусы «Guda», «Стары Ольса», «Палац», расійска-беларускі гурт «Hvarna», украінскія каманды «Фолькнери» і «ДахаБраха», польскі «Orkiestra Sw. Mikołaja».

*Падрабязней чытайце ў наступным нумары газеты.*

✓**7 – 8 верасня** ў Навагрудку адбыўся **XVI міжнародны фэст сярэднявечнай культуры «Навагрудскі замак-2013»**. У прагараме былі спаборніцтвы лучнікаў і мечнікаў, бугурты, конны турнір, інсцэніроўка каранацыі Міндоўга, а таксама выступы гуртоў, што граюць сярэднявечную музыку і яе сучасныя інтэрпрэтацыі.

